Як прайшоў парад у Мінску

04.07.2019 00:04

Аўтар: Марыя Дадалка (/be/author/maryya-dadalka)

Фота: Ганна Занкавіч (/be/author/ganna-zankavich) / Таццяна Ткачова (/be/author/taccyana-tkachova)

Грамадства (/be/gramadstva)

Шоу асілкаў, кірмаш цудоўных вырабаў, легендарны Т-34 на галоўным праспекце і феерычны салют — Мінск, а разам з ім і ўся краіна з размахам адзначылі Дзень Незалежнасці і 75-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Карэспандэнты «Звязды» з раніцы да вечара былі ў самым эпіцэнтры падзей, каб расказаць і паказаць чытачам, як беларуская сталіца сустрэла свята.



(https://sozvezdie.by/)

Каля 80 канцэртаў у розных раёнах Мінска былі падрыхтаваны для мінчан і гасцей горада да 3 ліпеня. Самыя маштабныя гулянні разгарнуліся на пляцоўцы каля Палаца спорту. Для прысутных працавалі фудкорты з разнастайнымі стравамі беларускай і іншай кухні, былі ўсталявалі сталы з пасадачнымі месцамі для дзвюх тысяч чалавек. Непадалёку размясціліся рады з прылаўкамі майстроў, у якіх можна было набыць разнастайныя хэндмэйд-упрыгожанні, цацкі, кавальскія вырабы і шмат іншага. Для гараджан зладзілі канцэрт. А трынаццатай гадзіне пачаўся турнір па сілавым экстрыме «Minsk Strong Battle — 2019».

У гэты асаблівы дзень на галоўных вуліцах з кожным годам менш тых, каму ў першую чаргу прысвечана свята вызвалення і каму мы абавязаны сваёй незалежнасцю, — у Мінску пражывае крыху больш за 1700 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Самым маладым з іх ужо амаль 90 гадоў, таму сустрэць іх у шумных гуляннях складана. Але шматлікая моладзь, якая ўдзельнічае ў святочных мерапрыемствах, імкнецца выказаць ім словы падзякі.



«У Дзень Незалежнасці адчуваецца гонар за нашу краіну і яе незалежнасць. Нашы бабулі і дзядулі падчас вайны былі маленькія, але яны памяталі гэтыя падзеі і расказвалі нам, — дзеляцца прыгажуні Таццяна і Настасся, якіх мы сустрэлі на гуляннях. — Трэба абавязкова падзякаваць ветэранам. Трэба, каб моладзь іх ведала ў твар, каб пра іх расказвалі. Ветэранаў застаецца няшмат, і трэба ўсімі сіламі дапамагаць пераможцам».

Акрамя моладзі, на галоўных забаўляльных пляцоўках сталіцы былі і прадстаўнікі старэйшага пакалення. Каля імправізаванай фотазоны з рарытэтнымі аўтамабілямі мы пазнаёміліся з вайскоўцамі ў адстаўцы. Палкоўнік запасу Мікалай Аляксеевіч расказаў, што асабіста для яго значыць свята вызвалення. «На пачатку вайны мне было 10 гадоў, але я памятаю яе пачатак, як бацька на вайну пайшоў. Ён у мяне таксама ваенны чалавек быў. Першая палова вайны была асабліва цяжкая для савецкага народа, — успамінае новы знаёмы, і ў яго вачах я адразу заўважаю самоту. — Дзякуючы дзеянням беларускіх, украінскіх партызан немцаў змучылі, і да Масквы яны прыйшлі ўжо змардаваныя. Я сам расіянін па нараджэнні, але ўжо лічу сябе беларусам — жыву тут 30 гадоў. Наш народ у той час быў згуртаваны. І сучаснае маладое пакаленне павінна разумець: калі мы ўсе будзем адзіныя, тады нам нічога не страшна».

Нечакана надвор'е змянілася і наляцела хмара. Мы таксама схаваліся пад дахам аднаго з павільёнаў. Пакуль чакалі, калі скончыцца дождж, завязалі размову з Надзеяй. «Няхай нават надвор'е дрэннае, але святкаваць трэба абавязкова. Будні нашы не такія простыя, таму трэба радавацца. Паглядзіце на італьянцаў, яны ж без свята не жывуць. А мы, беларусы, часам ходзім пахмурныя. А гэта свята натхняе, — адзначае жанчына. — У мяне тата рускі, але ён удзельнічаў у вызваленні Гомельскай вобласці. Для яго гэтыя святы былі асаблівыя. Трэба захоўваць памяць і для моладзі, каб яны ведалі і паважалі традыцыі».

(h



75-я гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — свята не толькі для нашага народа. Каля Палаца спорту мы сустрэлі калегу, журналіста прававога партала Гусейнсоя Яшара. У руках ён трымаў партрэт Героя Савецкага Саюза Наджафгулу Рафіева, імя якога ўвекавечана ў назве адной з вуліц Маскоўскага раёна сталіцы. Як мы даведаліся, карэспандэнт прыехаў на свята ў Мінск з Азербайджана. «Я прыехаў, каб успомніць пра герояў-азербайджанцаў, якія прымалі ўдзел у вызваленні Беларусі. Гэта Герой Савецкага Саюза малодшы лейтэнант Рафіеў, камандзір узвода, — паказвае ён на партрэт. — Калі савецкія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Беларусі, яго ўзвод абышоў ворага з тылу і адкрыў праход іншым часцям для ўдару па ворагу».



(h





(h



Увечары святкаванне перамясцілася да абеліска «Мінск — горад-герой». Там чакалі пачатку кульмінацыі дня — парада войск Мінскага гарнізона. Сёлета галоўную падзею перанеслі на вечар.



А дзявятай гадзіне сэрцы гледачоў, здаецца, замерлі ў трывожна-святочным чаканні: над горадам пачуўся гул авіяцыі. Сучасныя баявыя самалёты і верталёты разрэзалі неба сталіцы, быццам чырвоную стужку, і распачалі парад.

Затым у строі прамаршыравалі 25 пешых парадных разлікаў. Упершыню ў парадзе прынялі ўдзел аж тры разлікі жанчын-вайскоўцаў. Два з іх прадстаўлены прыгажунямі Узброеных Сіл і адзін — супрацоўніцамі Міністэрства ўнутраных спраў.

Добрай традыцыяй стаў удзел у парадзе разлікаў Узброеных Сіл Расіі і Народна-вызваленчай арміі Кітая. Сёлета ў страі — і сцягавыя групы вайскоўцаў з Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, Узбекістана.

(h



Перад трыбунамі пранеслі Сцяг Перамогі, Дзяржаўныя сцягі Беларусі і СССР, штандары франтоў, якія вызвалялі Беларусь. Пачэснае месца знайшлі ў страі баявыя сцягі партызанскіх фарміраванняў ваенных часоў.

Дарэчы, прамаршыраваў і партызанскі парадны разлік. Яго ўдзел у парадзе — асаблівы знак пашаны і сімвал усенароднай барацьбы.

Увагу прысутных, асабліва маленькіх гледачоў, прыцягнуў парад ваеннай тэхнікі. Сёлета прадстаўлена 24 разлікі. 70 % узораў тэхнікі — найноўшая або якая прайшла найглыбейшую мадэрнізацыю. Як звычайна, узначальваў механізаваную калону легендарны танк Перамогі Т-34.



Завяршылася мерапрыемства, мабыць, самай чаканай дзеяй — пляц-парадам зводнай роты ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры.

Усяго ў ваенным парадзе прыняло ўдзел каля пяці тысяч вайскоўцаў, а ў складзе механізаванай калоны — больш за 280 адзінак колавай і гусенічнай тэхнікі. У паветраным парадзе было задзейнічана каля 50 самалётаў і верталётаў.

Акурат з завяршэннем парада і тэатралізаванага эпізоду «Беларусь гераічная» з акцыяй «Праспяваем гімн разам» неба над Мінскам расквеціў святочны салют.

(h





(h





(h





(h





(h





(h





(h





(h





(ht





(h





(h





(h





(h



Але на гэтым святкаванне не закончылася. Самыя трывалыя і бадзёрыя мінчане і госці сталіцы засталіся на канцэрт каля абеліска, дзе іх чакалі выступленні айчынных артыстаў з найлепшымі сучаснымі кампазіцыямі і хітамі мінулых гадоў.

Марыя ДАДАЛКА

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і Таццяны ТКАЧОВАЙ

Чытайце таксама

Работа па вяртанні імёнаў ахвяр канцлагера Штутгаф не спыняецца (/be/news/20191209/1575903419-rabota-pa-vyartanni-imyonau-ahvyar-kanclagera-shtutgaf-ne-spynyaecca)

75 гадоў таму быў расфарміраваны Беларускі штаб партызанскага руху (/be/news/20191125/1574688772-75-gadou-tamu-byu-rasformiravany-belaruski-shtab-partyzanskaga-ruhu)

Прэзентавалі кнігу «Перамога адна на ўсіх. Беларусь – Узбекістан» (/be/news/20191112/1573571208-prezentavali-knigu-peramoga-adna-na-usih-belarus-uzbekistan)

Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – 75 (/be/news/20191025/1572011145-belaruskamu-dzyarzhaunamu-muzeyu-gistoryi-vyalikay-aychynnay-vayny-75)

Здымаюць новыя серыі праекта «Беларусь памятае» (/be/news/20191017/1571317213-zdymayuc-novyya-seryi-praekta-belarus-pamyatae)

Тэгі: 75-годдзе вызвалення Беларусі (/be/tags/75-goddze-vyzvalennya-belarusi)

1062 прагляда Русский (/ru/news/20190704/1562193467-nash-glavnyy-den) Друкаваная версія (/be/print/163674)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20190704%2F1562187895-nash-galo
(https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20190704%2F1562187895-nash-gal
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%AF%D0%BA%20%D0%BF%D1%80%D0%B0%D0%B9%D1%88%D0%BE%
(viber://forward?text=%D0%AF%D0%BA%20%D0%BF%D1%80%D0%B0%D0%B9%D1%88%D0%BE%D1%9E%20%
(https://t.me/share/url?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20190704%2F1562187895-nash-galouny

Навіны Папулярнае

13:52 У Магілёве работнікі вынеслі з прадпрыемства больш за шэсць тон арматуры (/be/news/20230526/1685098331-u-magilyove-rabotniki-vynesli-z-pradpryemstva-bolsh-za-shesc-ton-armatury)

13:35 На другім энергаблоку БелАЭС пачалі выпрабаванні ў рэжыме поўнага абясточвання (/be/news/20230526/1685097314-na-drugim-energabloku-belaes-pachali-vyprabavanni-u-rezhyme-pounaga)

13:11 Якія напрамкі будуць разам развіваць вучоныя Беларусі і РФ (/be/news/20230526/1685095917-yakiya-napramki-buduc-razam-razvivac-vuchonyya-belarusi-i-rf)

12:51 VR-атракцыёны і анлайн-браніраванне. БЕЛАЗ рыхтуецца да новага сезона прамтурызму (/be/news/20230526/1685094685-vr-atrakcyyony-i-anlayn-braniravanne-belaz-ryhtuecca-da-novaga-sezona)

12:34 На пажары ў Ваўкавыскім раёне загінула дзіця (/be/news/20230526/1685093648-na-pazhary-u-vaukavyskim-rayone-zaginula-dzicya)

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

(https://declarant.by/ru/)

Іншыя матэрыялы аўтара

Раманаў: Ідэі аабноўленай Канстытуцыі павінны быць адлюстраваны ў праграме «Белай Русі» (/be/news/20220618/1655552431-sergeenka-golas-belay-rusi-pavinen-guchac-u-pounuyu-silu)

Работу з насельніцтвам на мясцовым узроўні разгледзелі на семінары-нарадзе з удзелам Лукашэнкі (/be/news/20220610/1654847535-rabotu-z-naselnictvam-na-myascovym-uzrouni-razglyadayuc-na-seminary-naradze)

Лукашэнка: Мы гатовы ўдзельнічаць у мадэрнізацыі ключавых сектараў эканомікі Курскай вобласці (/be/news/20220609/1654761931-lukashenka-prapanavau-stvaryc-u-kurskay-voblasci-sumesnyya-vytvorchasci)

Дэпутат пра рэспубліканскі бюджэт 2021 года: Усе запланаваныя сацыяльныя гарантыі выкананы (/be/news/20220608/1654697864-deputat-pra-respublikanski-byudzhet-2021-goda-use-zaplanavanyya-sacyyalnyya)

Прэзідэнт аб «Паўночным беразе»: «Больш буйнога праекта ў нас у Беларусі не было» (/be/news/20220607/1654587800-lukashenka-syonnya-sustrenecca-z-

(https://declarant.by/ru/)

Выбар рэдакцыі

(/be/news/20230525/1685028425-u-zone-uvagi-dzikiya-zhyvyoly-abo-yak-zahavac-zhyccyo-svayo-i-naselnikau)

Грамадства (/be/gramadstva)

У зоне ўвагі — дзікія жывёлы, або Як захаваць жыццё — сваё і насельнікаў лесу (/be/news/20230525/1685028425-u-zone-uvagi-dzikiya-zhyvyoly-abo-yak-zahavac-zhyccyo-svayo-i-naselnikau)

Праблемы і рашэнні.

0 186

(/be/news/20230525/1685028044-karespandent-zvyazdy-panazirala-yak-u-magilyouskay-voblasci-pracue)

Грамадства (/be/gramadstva)

Карэспандэнт «Звязды» паназірала, як у Магілёўскай вобласці працуе абагульненая даведка ЖКГ — 115 (/be/news/20230525/1685028044-karespandent-zvyazdy-panazirala-yak-u-magilyouskay-voblasci-pracue)

Дзе ДНК-тэст можна зрабіць? Вы ж 115! Павінны ведаць!

0 460

(/be/news/20230525/1685017609-mastacki-kiraunik-mte-uladzislava-arcyukouskaya-maya-galounaya-matyvacyya)

Культура (/be/kultura)

Мастацкі кіраўнік МТЭ Уладзіслава Арцюкоўская: Мая галоўная матывацыя — жыць паўнавартасна! (/be/news/20230525/1685017609-mastacki-kiraunik-mte-uladzislava-arcyukouskaya-maya-galounaya-matyvacyya)

Яе шчыльны графік распісаны наперад на гады.

0 376

(/be/news/20230514/1684074280-radnya-pracyag-tvaygo-zyamnoga-dnya-test-da-mizhnarodnaga-dnya-syami)

Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)

«Радня — працяг твайго зямнога дня...» Тэст да Міжнароднага дня сям'і (/be/news/20230514/1684074280-radnya-pracyag-

(http://dergarant.by/ru/)

tvaygo-zyamnoga-dnya-test-da-mizhnarodnaga-dnya-syami)

Кожны талент бярэ вытокі з сям'і...

0 3210

Нашы партнёры:

(http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://www.belros.org/) (http://ww

(/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2023 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ "Выдавецкі дом "Звязда".
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

6 359
4 356
4 183
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://ok.ru/group/zviazda.by/zviazda.by) (https://www.youtube.com/zviazda.by/zviazda.by/ne)

Создание сайта
webxayc.by (https://webxayc.by)